**С. С. Вярбіцкі**
*г. Слуцк, Беларусь*

# ВЫКАРЫСТАННЕ POETRY PROMPTS НА ЗАНЯТКАХ АНГЛІЙСКАЙ МОВЫ Ў 10 КЛАСЕ

Акцэнт на авалоданне мовай як сродкам непасрэднай і апасродкаванай камунікацыі абумоўлівае патрэбу засяродзіць увагу ў працэсе навучання мове на развіцці ў вучняў навыкаў карыстацца мовай і маўленчымі сродкамі

не толькі ў кантэксце рэпрадукцыйнай і прадукцыйнай дзейнасці па авалоданні ўсімі відамі моўных кампетенцый, але і ў змененых ці новых сітуацыях камунікацыі, як вуснай, так і пісьмовай [1, с. 24]. Выкарыстанне вершаў на занятках англійскай мовы дл я развіцця творчых здольнасцяў вучняў можна разглядаць як ужыванне крэатыўнай тэхналогіі. Паэзія дапамагае вучням эфектыўна фарміраваць граматычныя навыкі, узбагачаць слоўнікавы запас, спрыяць пераадоленню моўнага бар’ера, павялічваць матывацыю і асабістую зацікаўленасць [2, с. 93].

Асноўная задача настаўнікаў – павялічыць энтузіязм вучняў і ператварыць іх з пасіўных спажыўцоў ведаў у актыўных творцаў. Творчасць у спалучэнні са здольнасцю асэнсавана карыстацца такой складанай семіятычнай сістэмай, як мовай, разглядаецца як адметная рыса чалавека. Настаўнікі карыстаюцца тэхналогіяй творчага ліста, каб уцягнуць вучняў у працэс навучання замежнай мовы. Напісанне вершаў – гэта творчы падыход да глабальнага пашырэння валодання англійскай мовай [2, с. 93]. Спрабуючы перадаць свае пачуцці на іншай мове, людзі, якія вывучаюць замежную мову, могуць пачувацца раздражнёнымі, разгубленымі. Іх становішча пагаршаецца тым, што яны не могуць знайсці эмацыянальна падобную тэрміналогію, якая, па іх думцы, найлепей адлюстроўвае тое, што яны хочуць сказаць на іншай мове [3, с. 144]. Для прадухілення гэтай праблемы існуюць poetry prompts (паэтычныя падказкі).

**Poetry prompts** – гэта наборы слоў альбо фраз, якія выкарыстоўваюцца для стымулявання творчага працэсу напісання верша. Гэта могуць быць звычайныя словы, напрыклад, “зіма”, “птушкі”, “каханне”, альбо цэлыя сказы, напрыклад, “цёмная ноч на полі васількоў”, “мой першы дзень у школе”, “успаміны пра дзяцінства”, “imagine an invisible ghost picks up a pen and starts writing to you”, “write a poem where each line/sentence is about each day of last week.”

Паэтычныя падказкі спрыяюць навучанню пісьмовай мове, паколькі дапамагаюць напісаць асобны верш. У нашым артыкуле разглядаюцца паэтычныя падказкі, створаныя сучасным амерыканскім паэтам і педагогам Джозэфам Фасанам. Прапанаваныя ім poetry prompts адрозніваюцца ад звыклай формы тым, што маюць выгляд напісанага верша з пропускамі, у якія вучні мусяць упісаць патрэбную часціну мовы. Так, напрыклад, у адным з радкоў паэтычнай падказцы з *My Poem (Title)* трэба ўпісаць прыметнік, два назоўнікі і дзеяслоў: *‘Today I feel like a/an (adjective) (noun) (verb)ing in the (noun).’*, а ў паэтычнай падказцы пад назвай *Question poem (Title)* толькі назоўнікі, прыметнікі і ўласнае пытанне ў канцы верша:

*QUESTION POEM (Title)*
*Why is the (noun) (adjective)?*
*Why is the (noun) (adjective)?*
*Why is the (noun) (adjective)?*
*When I ask, I hear the song of my own (adjective) voice.*

*And then I know the answer.*
*The (noun) is (adjective),*
*the (noun) is (adjective),*
*and the (noun) is (adjective)*
*because we are meant to love the (adjective) questions.*
*(Insert a question of your own as the final line.)*

З мэтай выявіць стаўленне настаўнікаў да крэатыўных метадаў навучання замежнай мовы намі было праведзена апытанне сярод настаўнікаў ДУА “СШ № 12 г. Слуцка.” 100 % апытаных адзначылі, што станоўча ставяцца да крэатыўных метадаў у навучанні. Самым выкарыстоўваемым метадам (73 %) крэатыўнага навучання выявіўся прагляд кароткіх фільмаў альбо мультфільмаў на занятку і выкананне практыкаванняў па ім. 25 % настаўнікаў аддалі перавагу чытанню казак і іх інсцэнізацыі ў канцы занятку. Найменей папулярным метадам выявілася чытанне і аналіз вершаў (2 %). Вынікі апытання могуць быць звязаны з тым, што настаўнікі незнаёмыя з метадамі выкарыстання паэтычных падказак. Чытанне, напісанне і аналіз вершаў мы лічым прадуктыўным, таму прапануем варыянт працы па паэтычных падказках, каб павялічыць зацікаўленасць настаўнікаў і вучняў да паэзіі.

Створаныя амерыканскім педагогам педагагічныя падказкі з’яўляюцца своеасаблівым практыкаваннем на дапаўненне. Але, у адрозненне ад звычайных практыкаванняў, мэта паэтычных падказак – развіццё крэатыўнасці вучня.

Як і ў любым іншым тыпу моўнай дзейнасці, перад тым як брацца за працу па напісанні верша па паэтычнай падказцы, варта яе прааналізваць і растлумачыць вучням незразумелыя словы альбо граматычныя структуры. На **перадтэкставым** этапе настаўнік можа папрасіць іх падумаць, якая асноўная ідэя верша, звярнуць увагу вучняў на назву (love poem, grief poem, friendship poem). Вучні робяць некалькі прадказанняў пра назву. Кожны вучань, незалежна ад таго, працуе ён у групе альбо індывідуальна, павінен быць уцягнуты ў працэс дэкадавання. Настаўнік, атрымаўшы адказы вучняў, можа растлумачыць розныя аспекты тэксту. Ён можа арганізаваць і адшліфаваць гэтыя ідэі, каб адназначна прыйсці да агульнага разумення, звязаўшы папярэднія веды вучняў з новым вывучаным зместам. Пасля абмеркавання назвы настаўнік можа прадставіць ілюстрацыю, якая дае нагляднае ўяўленне аб тэксце, які абмяркоўваецца. Ілюстрацыя можа даць важныя падказкі для прагназавання зместу тэмы тэксту. Калі ілюстраванага тэксту няма, настаўнік можа папрасіць штучны інтэлект падрыхтаваць ілюстрацыю. А пасля, на **тэкставым** этапе, не запаўняючы пропускі, настаўнік кажа вучням прачытаць верш і абмеркаваць незразумелыя словы. Пасля тлумачэння незразумелых слоў, вучням даецца заданне запоўніць пропускі, такім чынам яны ствараюць асобны і ўнікальны верш. На **паслятэкставым** этапе вучням прапануецца прачытаць свае вершы.

Прыкладаем два вершы, напісаныя вучаніцамі 10 класаў:

*My Poem (I)*
*My name is Anastasiya.*
*Today I feel like a colourful butterfly flying in the ash.*
*Sometimes I am a girl.*
*Sometimes I am an insect.*
*But always I am beautiful.*
*I ask the world, "How so?"*
*And the answer is*
*A colourful butterfly.*

*My Poem (II)*
*My name is Yana.*
*Today I feel like a regular schoolgirl swimming in the sea.*
*Sometimes I am sad.*
*Sometimes I am happy.*
*But always I am learning.*
*I ask the world, "Who am I?"*
*And the answer is*
*A regular schoolgirl.*

Такім чынам, нягледзячы на простую і немудрагелістую прыроду, паэтычныя падказкі паляпшаюць моўныя здольнасці. Напісаўшы простыя вершы, вучні ствараюць уласны твор за адносна кароткі перыяд часу, выкарыстоўваюць знаёмую лексіку і адкрываюць новы слоўнікавы запас, карыстаюцца пэўнымі моўнымі структурамі, развіваюць упэўненасць у сваёй здольнасці дзяліцца пачуццямі ў пісьмовай форме.

## ЛІТАРАТУРА


1. Головань, И. В. Обучение креативной письменной речи на второй ступени общего образования : на материале немецкого языка : дис. … канд. пед. наук : 13.00.02 / И. В. Головань. – Москва, 2008. – 195 с.
2. Баскакова, М. А. Поэзия как одна из креативных форм при обучении английскому языку / М. А. Баскакова // Вестник науки и образования. – 2021. – № 14–1. – С. 92–96.
3. Chamcharatsri, P. B. Poetry writing to express love in Thai and in English: A second language (L2) writing perspective / P. B. Chamcharatsri // International Journal of Innovation in English Language Teaching. – 2013. – Vol. 2, №. 2. – P. 142–157.